Фразеалагізмы ў творах Лукаша Калюгі

В. В. Дубатоўка
БДПУ (Мінск)
Навук. кіраўн. – Н. П. Лобань, канд. філалаг. навук, дац.

Анатацыя. У артыкуле вызначаюцца асаблівасці ўжывання фразеалагізмаў у мастацкім тэксце Лукаша Калюгі, аналізуюцца фразеалагічныя адзінкі ў кантэксце, раскрываецца сутнасць і паходжанне фразеалагічных адзінак, характарызуецца мова пісьменніка.

Ключавыя словы: фразеалогія; фразеалагізм; мастацкі кантэкст.

Творчасць Лукаша Калюгі пачалася ў той час, калі ішло станаўленне беларускай літаратурнай мовы, яе сцверджанне як мовы дзяржаўнай. Мова пісьменніка ў сваёй аснове беларуская літаратурная, у якой выразна адлюстравалася лексіка і фразеалогія роднай Дзяржыншчыны, з яе метафарычнасцю, багатай сінанімікай і ацэначнасцю [1, с. 528]. Творца адштурхоўваўся выключна ад асаблівасцей беларускага (абавязкова сялянскага!) светаўспрымання, беларускай псіхалогіі, беларускай гаворкі.

Лукаш Калюга з'яўляецца аўтарам такіх апавяданняў, як “Выйшлі на цаліну” (1926), “Вясна” , “У Клянках” (1927), “Краўцы і Галяднікі”, “Лук’ян – капераціўскі сабака”, “Трахім з Пагулянкі”, “Баркаўцы – добрая вёска, і баркаўчане – вясёлыя людзі” (1928), аповесцей “Нядоля Заблоцкіх” (1931), “Ні госць, ні гаспадар” (1928), твораў з-за крат: рамана “Пустадомкі” (1933–1935), аповесці “Дзе косці мелюць”, апавяданняў “Зоры Вам Вядомага горада”, “Утрапенне” (1935) і інш. Усе творы Лукаша Калюгі характарызуюцца непаўторным арыгінальным стылем, тонкім псіхалагічным майстэрствам, што робіць аўтара адным з самых самабытных празаікаў 20-х – пачатку 30-х гадоў XX ст., а яго творчасць прыкметнай з'явай у гісторыі беларускай літаратуры.

Мова першых твораў празаіка вылучаецца выкарыстаннем наватвораў, цікавых моўных выразаў, запамінальных фразеалагізмаў. Пісьменнік актыўна ўключаў у свае аповесці і апавяданні народныя легенды, звычаі, прыкметы, павер’і. Тут мы знойдзем асобныя дыялектныя і вузкаўжывальныя словы: напрыклад, *шкілёнда* – 'каўбаса з вантробаў', *нізаводня* – 'неадкладна, тэрмінова', *распасорыць* – 'растраціць', *рупясць* – 'рупеск, клопат', *аблудны* – 'бадзяжны', *прыкладка* – 'мянушка, назоўка', *бесхацінцы* – 'людзі, якія не маюць хат' і інш., фразеалагізмы і аўтарскія выразы: *абабраць лёстачку* – 'аб'есці мяса з рабрыны', *лопаніны няма* – 'смерці няма', *глядзець ручным ягнём* – 'быць знешне пакорлівым, патульным' і інш. На нашу думку, творчасць гэтага цікавага, таленавітага пісьменніка заслугоўвае больш пільнай увагі, а мова яго твораў – дасканалага вывучэння. Асабліва актуальным падаецца даследаванне фразеалагічнага багацця яго твораў.

Цэнтральнай фігурай у фразеалагізмах найчасцей выступае чалавек ва ўсіх сваіх разнастайных праявах. Адам Бабарэка невыпадкова заўважыў, што чалавек ў творах Лукаша Калюгі, асабліва ў “Нядолі Заблоцкіх” “...*бывае* розны: і змыслы, і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

даходны, і ліхі, і не абы-які, і славен, і абрыдзоны, і патрэбны, і гаспадарскі, і наш, і чужы... У кожнага з іх свае граніцы. Дык ці не ёсць гэта й чалавек быццё толькі (прыгадай адпаведны выраз “быць ці стаць чалавекам”). Чалавек – гэта тое, чым *бывае* чалавек для чалавека” [Цыт. па: 1, с. 569–570]. І сапраўды, Лукаш Калюга ставіць і спрабуе даць адказ на пытанні: чым ёсць “наш чалавек” у свеце і што ён сам па сабе?

Як паказвае даследаваны матэрыял, з глыбокім пачуццём меры і мастацкай мэтазгоднасці ўжывае Лукаш Калюга народныя фразеалагізмы. Разгледзім некаторыя з іх.Так, напрыклад, характарызуючы вельмі балбатлівага чалавека Лукаш Калюга напіша: “Трэба не вельмі *распушчаць язык”* [1, с. 297], дзе ўсім вядомы фразеалагізм ужываецца са значэннем 'не стрымлівацца ў сваіх выказваннях, дазваляць сабе гаварыць шмат лішняга' [2, т.2 с.267]. А на наступнай старонцы сустракаем: “Калі лішняе хто пачне перад ім *з берагоў выліваць,* дык яшчэ горш напружыцца…” [1 , с. 298]. Фразеалагізм *з берагоў выліваць* сінанімічны папярэдняму, але вызначаецца яшчэ большай ацэначнасцю ў параўнанні з *распушчаць язык: з берагоў выліваць* – 'залішне гаварыць, гаварыць непрыемнае, непажаданае' [2, т. 2, с. 267].

Цікавымі, на наш погляд, з’яўляюцца наступныя фразеалагізмы. *Патрубіць у кулак* (“*Патрубіш у кулак...* , як бяда прыпрэ” [1, с. 53]) і *ў кулак трубіць* (“На печы дзеці *ў кулак трубяць*, есці просяць…” [1, с. 295]). Усё гэта варыянты аднаго фразеалагізма, які мае значэнне – 'гарадаць, жывучы ў крайняй беднасці' [2, т. 2, с. 326], і які вельмі трапна характарызуе сацыяльнае становішча чалавека, яго сям'і.

Фразеалагізм *крукам гнуцца* ўжываецца са значэннем 'многа і цяжка працаваць' [2, т. 1, с. 277]: “Цалюткія два тыдні *крукам гнуўся* Хвядос Чвардоўскі над кніжкамі…” [1, с. 34]; “Але потым баяўся, каб не падвяла памяць, каб *не вярзці лухту* на экзамене” [1, с. 34], дзе *вярзці лухту* – 'гаварыць няпраўду, бязглуздзіцу, гаварыць што-н. без сэнсу, не думаючы; выдумваць' [2, т. 2, с. 16].

Са значэннем 'вельмі хутка, з усёй сілы' [2, т. 2, с. 586] ужываецца фразеалагізм *шпарчэй маланкі*: “*Шпарчэй маланкі* ён (Платон) апыніўся там, дзе рогат” [1, с. 56], са значэннем 'паспешліва, хутка' [2, т. 1, с. 292] – фразеалагізм на *борздую руку:* “Хвядос у сенцах на цвіку знайшоў свой картовы фрэнч з паадрыванымі ўнізу кішэнямі, *на борздую руку* зірпнуў у люстэрка, паправіў шапку ды выйшаў на двор” [1, с. 51], фразеалагізм *скула пад вокам* мае значэнне 'вялікая перашкода, што раздражняе каго-н. наяўнасцю ці прысутнасцю': “Ты – *скула пад* яго (Вінцэсевым) *вокам*, і яшчэ пакланіцца яму не хочаш” [1, с. 293].

Вядома, што частка беларускіх фразеалагізмаў узнікла на аснове легенд, якія адлюстроўваюць жыццё, быт людзей, іх рысы характару, паводзіны. У гэтым плане цікавым з’яўляецца фразеалагізм *зарабіць, як Заблоцкі на мыле*. У “Этымалагічным слоўніку фразеалагізмаў” І. Я. Лепешава гэты фразеалагізм зафіксаваны са значэннем ’прайграць справу, прагадаць, панесці страту'. Падаецца як агульны для беларускай і польскай моў (jak Zabłocki na mydle): “Хто нам цяпер заплаціць?.. На прыгажосці выгадаем!.. Выгадалі! *Як Заблоцкі на мыле*!..” [3, с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

52]. Узнікненне фразеалагізма звязваецца з наступнай гісторыяй: купец Заблоцкі, каб не плаціць пошліны, вырашыў правезці кантрабандай мыла, выменене за граніцай на жыта, і схаваў яго на дне судна, дзе яно размокла. Пра гэта ёсць у аповесці Лукаша Калюгі "Нядоля Заблоцкіх", дзе аўтар гумарыстычна прывязвае легенду да сваіх персанажаў: "Край свету чулі пра Заблоцкага. Ведаюць, што з мылам быў заняўся гэты чалавек. Ведаюць, што не заработак, а ўтрата ў яго на гэтым тавары выйшла… А таго не ведаюць, што наш гэта чалавек – з Баркаўцоў, і ўсе тыя прыгоды не немаведама дзе, а паблізу гэтай вёскі рабіліся" [1, с. 220].

У творах Лукаша Калюгі часам сустракаюцца запамінальныя прыказкі і прымаўкі, якія ў шырокім сэнсе таксама адносяцца да фразеалогіі і якія надаюць творам непаўторны мастацкі эфект, напрыклад: *Дзе воўк радзіўся, там і куст яму міл* [1, с. 43]. Прыказка ўжываецца з адценнем любові і замілавання да роднага краю, да мясціны, дзе нарадзіўся хто-небудзь.

Лукаш Калюга з'яўляецца найвыдатнейшым празаікам, што пакінуў значны след у беларускай літаратуры 20–30 гг. XX ст. Аднак і сёння мова яго твораў з'яўляецца адной з найбольш цікавых для даследавання і вывучэння. Усёй сваёй творчасцю пісьменнік не толькі сцвярджаў каштоўнасці традыцыйнай народнай маралі, але і адным з першых паспрабаваў разабрацца ў сутнасці новага грамадства. Як слушна адзначыў Яўген Легка, "і няхай сабе на долю такіх, як Лукаш Калюга, выпалі нялёгкія выпрабаванні і яны не здолелі раскрыцца на ўсю моц сваіх творчых магчымасцяў, <…> усё ж яны не здрадзілі чалавечнасці і назаўсёды засталіся перад сваім народам чыстымі душой" [Цыт. па: 4].

Літаратура

1. Калюга, Л. Творы : раман, аповесці, апавяданні, лісты / Л. Калюга ; уклад., прад. Я. Р. Лецкі ; камент. Н. В. Гаўрош, Т. М. Трыпуцінай. – Мінск : Маст. літ., 1992. – 607 с.
2. Лепешаў, І. Фразеалагічны слоўнік беларускай мовы : у 2 т. / І. Лепешаў. – Мінск : Маст. літ., 1993–2008.
3. Лепешаў, І. Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў / І. Лепешаў. – Мінск : БелЭн, 2004. – 448 с.
4. Лукаш Калюга // Дзержинская центральная районная библитотека [Электронны рэсурс]. – Режим доступа: http://www.dzerlib.by/pages/dzerlit/imenu/picmenniki_zemlyaki/09kaluga.html – Дата доступа: 17.03.2017.
5. Лукаш Калюга // Вікіпедыя [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: hhttps://be.wikipedia.org/wiki/%D0%9B%D1%83%D0%BA%D0%B0%D1%88_%D0%9A%D0%B0%D0%BB%D1%8E%D0%B3%D0%B0. – Дата доступу: 17.03.2017.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ